*А. І. Смолік,*
*доктар культуралогіі, прафесар,*
*загадчык кафедры культуралогіі*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# САЦЫЯДЫНАМІКА КУЛЬТУРЫ ЯК ПРАБЛЕМНАЕ ПОЛЕ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРАЛОГІІ

У беларускім грамадстве, якое ажыццяўляе мадэрнізацыю, нароўні з дынамічнымі працэсамі ў матэрыяльна-вытворчай сферы адбываюцца і важныя духоўныя пераўтварэнні. У сферы культуры фарміруецца і набірае моц духоўная сінэргія, якая спрыяе кансалідацыі грамадства і мабілізацыі намаганняў народа на рашэнне задач, звязаных з мадэрнізацыяй беларускага грамадства. Духоўная сінэргія з'яўляецца вынікам працяглай сацыядынамікі культуры. У сувязі з гэтым у якасці найважнейшай задачы айчынных культуролагаў выступае даследаванне змяненняў у культуры, бо яна ўяўляе сабой галоўны элемент духоўнай абароненасці нашай краіны. А. Моль, маючы на ўвазе велізарнае значэнне культуры, адзначаў, «што не існуе іншай каштоўнасці, акрамя самой культуры, што чалавек у грамадстве не мае іншага значэння, акрамя той ролі, якую ён адыгрывае ў калектыўным прагрэсе чалавецтва» [4, с. 154].

Актуальнасць звароту беларускіх гуманітарыяў да мадыфікацый і трансфармацый, што адбываюцца ў культуры, вызначаецца яе роляй у жыцці грамадства XXI ст., з дапамогай якой у значнай ступені інтэрпрэтуецца і ацэньваецца наша рэчаіснасць. Культура развівае інтэлект і духоўныя патрэбы, інтарэсы і здольнасці асобы, яна далучае яе да духоўна-маральных ідэалаў, без якіх сучаснае сацыяльнае існаванне немагчыма [8, с. 164].

У сувязі з гэтым магістральным кірункам айчыннай культуралогіі з'яўляюцца даследаванні разнастайных аспектаў сацыядынамікі духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа. На працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў культуролагі Беларусі імкнуліся асэнсаваць складаную, шматгранную сучасную айчынную культуру, якая дынамічна развіваецца, у якой увасабляюцца творчыя здольнасці чалавека і яго духоўны свет.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская культура ў першай чвэрці XXI ст. адчувае моцны ўплыў нацыянальна неафарбаваных, этнічна нявыражаных глабальных аксіясеміятычных сістэм, што ўскладняе працэсы нацыянальна арыентаванага тэкстаўтварэння, паслабляе пазіцыі нацыянальных аксіялагічных і семіятычных структур, абвастрае негатыўныя аспекты ў сацыякультурнай дынаміцы. З гэтай нагоды выяўленню шляхоў захавання і развіцця самабытнасці беларускай нацыянальнай культуры ў кантэксце супярэчнасцей сучаснай глабалізацыі прысвечаны шэраг навуковых прац культуролагаў. Грунтоўна спецыфіку функцыянавання ачыннай культуры ў кантэксце сусветнай глабальнай культуры даследуе акадэмік НАН Беларусі Я. М. Бабосаў. У яго шматлікіх фундаментальных працах абазначаны новыя канцэптуальныя падыходы да даследавання сацыякультурных аспектаў супярэчлівага постіндустрыяльнага беларускага грамадства, уплыву навукі і тэхнікі на развіццё духоўнага свету чалавека, таксама аналізуюцца праблемы ўзаемаадносін чалавека, грамадства і культуры [1].

Адначасова з выяўленнем негатыўных наступстваў глабалізму ў нацыянальнай культуры беларускія даследчыкі адзначаюць, што ў трансляцыйным сектары ўзаемадзеянне беларускай культуры з глабальнымі культурнымі плынямі адбываецца не толькі ў форме канфлікту паміж аўтэнтычнымі, нацыянальнымі і глабальнымі тэкстамі культуры, але і ў форме ўзаемаўзбагачэння і ўзаемадапаўнення. Гэту акалічнасць адзначаюць у сваіх працах такія айчынныя культуролагі, як У. П. Скараходаў [7], Ю. І. Кнацько, [5], А. Э. Салікаў [6] і інш. Так, Н. Я. Шалупенка падкрэслівае, што асаблівасць сацыядынамікі беларускай культуры на сучасным этапе развіцця вызначаецца ўстойлівасцю традыцыйнага поля культуры. Традыцыя як форма пераемнасці культуры забяспечвае захаванне, перадачу, узнаўленне і назапашванне дамінантных каштоўнасцей нацыянальнай культуры. Навацыі, якія выконваюць функцыю ўзбагачэння культуры, імкнуцца да таго, каб стаць сацыякультурным эталонам, агульнапрынятым у сістэме нацыянальнай культуры [10].

Велізарная роля ў захаванні асноўных традыцыйных каштоўнасцей, па меркаванні доктара культуралогіі У. П. Скараходава, належыць творчай асобе. У яго навуковых працах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналізуецца культуратворчая дзейнасць суб’ектаў айчыннай мастацкай культуры, якія супрацьстаяць бездухоўнасі і амаральнасці маскульту і ва ўмовах глабалізацыі захоўваюць і памнажаюць этнічнае і нацыянальнае ў беларускім мастацтве [7].

Праблема, вакол якой сфакусіравана даследчая дзейнасць культуролага гродзенскай навуковай школы С. У. Данскіх, – дынаміка этнакультурных працэсаў памежжа. Ім асэнсоўваюцца змены, якія пад уздзеяннем глабалізацыі адбываюцца падчас міжкультурнай камунікацыі. Гэтыя змены навуковец абазначае як інтэрыярызацыю этнічных параметраў у сучасных этнакультурных супольнасцях. На погляд даследчыка, у такіх умовах ролю вызначэння сутнасці і зместу этнічных культур павінны адыграваць суб’ектыўныя фактары, «унутраныя» параметры: агульнасць самасвядомасці, нацыянальны характар, этнічная ідэнтыфікацыя, архетып, менталітэт і г. д. [3].

Даследаванням генэзісу, сутнасці і спецыфікі канфігурацыі традыцыйнай культуры ўсходнеславянскага памежжа (Гомельска-Бранска-Чарнігаўскага рэгіёна), тэндэнцый яе развіцця ў кантэксце мультыкультуралізму прысвечаны навуковыя працы Г. В. Вахтомава. Ён прыходзіць да высновы, што на дадзеным памежжы сфарміравалася своеасаблівая канфігурацыя традыцыйнай культуры рэгіёна, якая ўяўляе сабой гарманічную сістэму каштоўнасцей, сімвалаў, маральных норм, звычаяў, абрадаў, арнаментальных і тэхналагічных асаблівасцей народнай мастацкай творчасці беларусаў, рускіх і ўкраінцаў [2].

Спецыфічныя асаблівасці мультыкультурных стратэгій узаемадзеяння этнакультурных груп беларускага грамадства прасочвае ў сваіх даследаваннях А. А. Спірына (Крыштаносава). Ёю таксама асэнсоўваюцца аб’ектыўныя ўмовы і фактары палітыкі мультыкультуралізму з пункту гледжання дыялогу і талерантнага стаўлення беларусаў да іншых культур [9].

Такім чынам, у цэнтры ўвагі айчыннага культуралагічнага дыскурсу ў аналізуемы перыяд былі праблемы функцыянавання і развіцця духоўнай і матэрыяльнай культуры. Вынікі даследавання развіцця сведчаць, што сацыякультурная дынаміка ў гэтай галіне беларускага грамадства мае пэўныя спецыфічныя асаблівасці. Культурныя працэсы носяць пераважна эвалюцыйны характар. Гістарычнае змяненне культуры адбываецца паступова, без вострай сацыяльнай барацьбы, у выглядзе дэсе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мантызацыі яе асобных рыс і форм. Узнікненне новых культурных форм ажыццяўляецца па розных мадэлях: па шляху эвалюцыі ўскладнення іх арганізацыі і структуры, павышэння яе ўстойлівасці і функцыянальнай універсальнасці; мадэрнізацыі ў бок узмацнення іх утылітарнасці і сацыяльнай эфектыўнасці; рэактуалізацыі класічных культурных форм і ўключэння іх у сацыяльную практыку; інтэграцыі новых культурных форм у існуючую культурную сістэму.

Ажыццяўляемыя ў беларускім грамадстве трансфармацыі прывялі да паступовага нарастання пазітыўных змен у сацыякультурнай сферы. З сярэдзіны 90-х гг. XX ст. пачынаецца якасна новы этап фарміравання транзітыўнай полістылістычнай культуры, якая характарызуецца паступовым развіццём антыдэструктыўных механізмаў.

1. *Бабосов, Е. М.* Социальные аспекты научно-технической революции / Е. М. Бабосов. – Минск : Навука і тэхніка, 1995. – 472 с.

2. *Вахтомаў, Г. В.* Традыцыйная культура як фактар устойлівага развіцця ўсходнеславянскай супольнасці / Г. В. Вахтомаў // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2005. – Т. 49, № 2. – С. 121–124.

3. *Донских, С. В.* Щучин: локальная история в контексте региональных процессов / С. В. Донских. – Минск : Четыре четверти, 2019. – 332 с.

4. *Моль, А.* Социодинамика культуры / А. Моль. – М. : Прогресс, 1973. – 406 с.

5. *Кнатько, Ю. И.* Белорусская культура в контексте современных трансформационных процессов [Электронный ресурс] / Ю. И. Кнатько // Национальная культура глазами молодых : сб. материалов XXXIX итоговой науч. конф. студентов, магистрантов, аспирантов, Минск, 26–27 марта 2014 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: В. Р. Языкович (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2014. – 1 электрон. компакт-диск (CD-R). – Режим доступа: http://www.buk.by/process/fakultet%201/Cultural/employees/knatko/. – Дата доступа: 20.10.2020.

6. *Саликов, А. Э.* Национальная культура в условиях глобализации / А. Э. Саликов // Вестн. молодежн. науч. об-ва. – 2004. – № 3. – С. 56–58.

7. *Скараходаў, У. П.* Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі / У. П. Скараходаў. – Мінск : БелДІПК, 2003. – 343 с.

8. *Смолік, А. І.* Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 276 с.

9. *Спирина, Е. А.* Мультикультурализм как стратегия взаимодействия этнокультурных групп / Е. А. Спирина. – Минск : РИВШ, 2012. – 224 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Шелупенко, Н. Е.* Региональные аспекты развития культуры Беларуси на современном этапе / Н. Е. Шелупенко // Весн. Беларус. дзярж. ін-та праблем культуры. – 2004. – С. 140–142.

***О. М. Соколова,***
*кандидат культурологии,*
*начальник отдела редакционно-издательской и полиграфической работы,*
*доцент кафедры культурологии*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

# ПАМЯТНИК КАК ОБЪЕКТ АКТУАЛИЗАЦИИ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ: КРИТЕРИИ ЦЕННОСТНОЙ ХАРАКТЕРИСТИКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Памятником может стать любой объект, созданный человеком или природой. Одни объекты, например скульптуры исторических деятелей, мемориалы и монументы, создаются как памятники, другие – сооружения, природные объекты – становятся памятниками со временем. В значительной степени ценность старого в современном понимании определяется потребностью человека в наследии, детерминируется многовековой историей почитания знаковых городских объектов. Для современного общества сохранение, почитание и актуализация наследия являются неотъемлемыми составляющими представлений о качестве жизни [8, с. 93].

Охрана историко-культурного наследия определяется как одно из важных направлений в рамках национальных и международных программ и стратегий развития. В то же время включение в список историко-культурных ценностей, присвоение категории и наличие охранной таблички зачастую не спасают объект, признанный памятником, от вмешательства в изменение его облика, вплоть до разрушения.

Признание ценности памятника, которое формируется под влиянием многих социокультурных факторов, определяет его жизненный цикл: от создания, естественной жизни, в ряде случаев – разрушения (культурной катастрофы) и забывания (семиотической паузы), до изучения, институционализации, легитимации в качестве объекта историко-культурного наследия и